родители. Наряду с образцами существуют также антиобразцы. Задача последних – дать отталкивающие примеры поведения и тем самым отвратить от такого поведения. Воздействие антиобразца в случае некоторых людей оказывается даже более эффективным, чем воздействие образца.

Метод аналогии – способ, требующий не только ума, но и богатого воображения, исполненный поэтического полета, но не дающий твердого знания, а нередко и просто вводящий в заблуждение. В сказке Л. Кэрролла «Алиса в Стране чудес» есть такой диалог. Алиса спрашивает Чеширского кота:

– А откуда вы знаете, что вы не в своем уме?

– Начнем с того, что пес в своем уме. Согласна?

– Допустим, – согласилась Алиса.

– Дальше, – сказал кот. – Пес ворчит, когда сердится, а когда доволен, виляет хвостом. Ну а я ворчу, когда я доволен, и виляю хвостом, когда сержусь. Следовательно, я не в своем уме.

Таким образом, пониманием технологий конструирования убеждающего дискурса определяется успешность общения. Ключевыми моментами являются рациональный анализ отношений между доводами и утверждениями и ориентация на определенную аудиторию, в соответствии с компетенциями, которой ощущается подбор аргументов.

### Литература

1. *Аристотель.* Риторика // Логика и риторика. Хрестоматия. Мн., 2007. С. 126–153.
2. *Ивин А.А.* Основы теории аргументации. М., 1997.

## РЭЛІГІЙНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ 18 СТАГОДДЗЯ

**Д. А. Смалякоў, А. А. Лягчылін**

Перад тым, каб весці гаворку пра рэлігійную ідэнтычнасць у Рэчы Паспалітай 18 ст. варта акрэсліць тыя змены, які адбываліся ў культуры Еўропы цягам 16–17 ст.ст. і без чаго не будзе зразумела унікальнасць сітуацыі 18 ст.

**Па-першае**, цягам 16–17 ст.ст. насельніцтва Еўропы значна ўзбуйнела. Пашырыліся гарады. Геаграфічныя адкрыцці прынеслі эканамічны пад'ём і ў тым ліку павялічыўся дабрабыт насельніцтва.

**Па-другое**, цягам 16–17 ст.ст. еўрапейскія краіны радыкальна павялічылі свае войскі. Радыкальнае павялічэнне колькасці войскаў выклікала радыкальнае павілічэнне падаткаў [1:300]. Падаткі былі пат-

рэбны як на самі войскі, так і на павялічаную армію чыноўнікаў, якія збіралі гэтыя падаткі. Падаткаабкладальныя саслоўі (мяшчане і сялянства) пачалі быць надзвычайна залежны ад палітыкі сваёй дзяржавы, а таму цягам 16–17 ст.ст. адбываецца радыкальная палітызацыя грамадства.

**Па-трэцее**, цягам 16–17 ст.ст. гарадскія эліты падначальваюць сабе эканамічнае і духоўнае жыццё цэркваў. Калі ў пратэстанцкіх краінах гэта быў натуральны працэс звязаны з асаблівасцю пратэстанцкіх дактрын, то праваслаўе прыйшло да гэтага праз слабасць царкоўнай іерархіі, а каталіцтва, дзякуючы канкурэнцыі з магнатамі і іншым дваранствам, за ўладу. Мяшчане сталіся галоўнымі спажыўцамі і вытворцамі кніжнай прадукцыі.

**Па-чацвертае**, панаванне мяшчан у галіне рэлігіі выявілася ў камерцалізацыі яе [1:277–282]. Калі ранейшая камерцалізацыя рэлігіі была звязана з карупцыяй царкоўнай іерархіі (продаж збаўлення ад грахоў, санкцыяванне развода, здача ў арэнду царкоўнай маёмасці), то цяпер з суправаджэннем паломніцтваў, продажам сувеніраў, таннай кніжнай прадукцыі і д.п.

**Па-пятае**, палітызацыя, і агульная карумпаванасць царкоўнай і палітычнай улады прывяло да заклапочанасці мяшчанства рэлігійнай і палітычнай сітуацыяй у краіне. Цяпер мяшчане маглі паўставаць не толькі на караля, але і змяняць царкоўную іерархію, калі тая, на іх думку, дзейнічала на шкоду рэлігіі.

Згаданыя акалічнасці прывялі да кардынальных зменаў у культуры. Дамінаванне мяшчан прывяло да знішчэння сярэднявечнага погляду на рэлігійнасць. Гэта выявілася як ў пераследзе культу святых, так і ў стасунку да музыкі, мастацтва, карнавалаў. Цаніцца пачала «сапраўдная» рэлігійасць, якая выяўлялася ў штодзённым асабістым выкананні рэлігійных рытуалаў, такіх як спяванне псальмаў і чытанне рэлігійных кніг. Прычым менавіта рэлігійнай дзейнасцю пачалі замяняцца традыцыйныя забавы паспалітага люду, а таму замест ранейшых карнавалаў, прагляду батлейкі, спявання баладаў і п'янства мяшчанства прывіла новы займеннік у выглядзе рэлігійнай музыкі, спявання псальмаў, чытанне рэлігійнай літаратуры.

Усе гэтыя акалічнасці ў вялікай ступені тычацца і Рэчы Паспалітай. Асаблівасць рэлігійнай ідэнтычнасці Рэчы Паспалітай 18 ст. заключаецца ў паліканфесіянальнасці краіны, дзе нацыянальныя і рэлігійныя меньшасці збольшага пражывалі ў гарадах. Так, напрыклад, у Рэчы Паспалітай пражывала самая вялікая ў свеце супольнасць юдэяў, якая налічвала 900 000 чалавек [3:181]. Тое ж тычыцца Праваслаўя, якое пасля раздзялення на Брэсцкім рэлігійным саборы на Уніяцкую і

Праваслаўную цэркву, выжыла ў гарадах. Не лішне згадаць і пратэстантаў, якія з сярэдзіны 16 ст. адыгрывалі знайчную ролю ў жыцці дзяржавы.

Павялічэнне ўплыву мяшчанскай супольнасці не магло не адбіцца на стаўленні з боку каталіцкага насельніцтва да дэсідэнтаў. Апроч гэтага, каталіцкая царква дамінавала ў Рэчы Паспалітай, была дзяржаўнай, а таму менавіта яна санкцыянавала дзейнасць іншых канфесій, давала дазволы на пабудовы храмаў, санкцыянавала форму публічнага выяўлення рэлігійнасці, рэгламентавала сацыяльныя статусы іншых канфесій [2:158].

Такі стан канкурэнцыі абумовіў спецыфіку рэлігійнай ідэнтычнасці Рэчы Паспалітай 18 ст. Па-першае, працэсы эканамічнай канкурэнцыі прывялі да сегрэгацыі насельніцтва па рэлігійнаму складу. Па-другое, рэлігіі пачалі розніцца па канфесійнаму прынцыпу, а значыць адрозніваліся не толькі набажэнствамі, але і комплексамі стаўленняў іх носьбітаў да аб’ектаў сацыяльнай рэальнасці.

**Литература**


1. *Бэрк П.* Народная культура Еўропы ранняга Новага часу. Пераклад з англ. І.Ганецкай, пад рэд. А.Ліса. Мн.: Тэхналогія, 1999. – 380 с.
2. *Бирало А.* Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII – середине XVIII в. Мн.: Изд. БГУ, 1971. – 180 с.
3. *Kalik J.* Attitudes towards the Jews and Catholic identity eighteenth-century Poland // Confessional Identity in East-Central Europe. ISBN 0 7546 0320 2. P. 181–194.


# ПРОБЛЕМАТИЗАЦИЯ КУЛЬТУРНОГО ДИАЛОГА «ВОСТОК-ЗАПАД» В СОВРЕМЕННОЙ ИНДИЙСКОЙ ФИЛОСОФИИ (НА ПРИМЕРЕ ТВОРЧЕСТВА ШРИ АУРОБИНДО ГХОША)


**Е. О. Станкевич, Т. Г. Румянцева**


«Интегральное сознание станет базисом всеобщей гармонизации жизни посредством тотальной трансформации, унификации и интеграции бытия и природы»

*Aurobindo Sri. The Life Divine. Vol. 2, p. 527*

Шри Ауробиндо Гхош (1872−1950гг) являлся ярчайшим представителем раннего этапа современной индийской философии, поэтом, революционером, одним из организаторов национально-освободительного движения в Индии, создателем уникальной философской системы – «интегральной» йоги, которая представляет собой громоздкое по охвату мно-